# Каляндар падзей Камянеччыны на 2023г.

**У 2023 годзе спаўняецца:**

- **735** гадоў з часу пабудовы **КАМЯНЕЦКАЙ ВЕЖЫ**, помніка абарончага дойлідства (г. Камянец; паводле Іпацьеўскага летапісу пабудаванай паміж 1276 і 1288 гг.)
- **520** гадоў з часу атрымання г. Камянцом **МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА** (1503)
- **290** гадоў з часу пабудовы **ВОЎЧЫНСКАГА ТРОІЦКАГА КАСЦЁЛА** (1733, Камянецкі р-н, *в. Воўчын),* помніка мураванай архітэктуры позняга барока
- **155** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА ПРАПАДОБНАГА АНУФРЫЯ ВЯЛІКАГА (**12.06.1868, Камянецкі р-н, *агр. Ставы*)
- **150** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА УСПЕННЯ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ** (24.06.1873, Камянецкі р-н, *в. Рэчыца*), помніка архітэктуры сінадальнага накірунку рэтраспектыўна-рускага стылю
- **150** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА ПРААБРАЖЭННЯ ГАСПОДНЯГА** (24.06.1873, Камянецкі р-н, *д. Трасцяніца*), помніка народнага дойлідства
- **90** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА СВЯЦІЦЕЛЯ МІКАЛАЯ ЦУДАТВОРЦА** (1933, Камянецкі р-н, *в. Вярховічы*), помніка архітэктуры з рысамі неаготыкі
- **80** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА РАЖКОЎСКАЙ ІКОНЫ БОЖАЙ МАЦІ** (1943, Камянецкі р-н, *в. Ражкоўка),* пабудаванага ў традыцыях народнага драўлянага дойлідства
- **20** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА СВЯТОГА АРХАНГЕЛА МІХАІЛА** (1993, Камянецкі р-н, *в. Расна*)
- **10 гадоў** з часу пабудовы **ХРАМА СВЯТОГА АПОСТАЛА МАРКА** (2013, Камянецкі р-н, *агр. Навасёлкі*)
- **75** гадоў з часу адкрыцця **АМЕЛЯНЕЦКАЙ СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ** (1948)
- **65** гадоў з часу адкрыцця **ДАЎБІЗНЯНСКАЙ СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ** (1958)
- **25** гадоў з часу стварэння Кямянецкага ўзорнага ансамбля эстраднага танца **«КАПРЫЗ»** (1998)

**125 гадоў** з дня нараджэння **МАКАРА ПАЎЛАВІЧА АБРАМЧУКА** (1898, Камянецкі р-н, *в. Дзмітровічы* – 1937), партыйнага і дзяржаўнага дзеяча БССР

**125 гадоў** з дня нараджэння **ЯНА ПЯРДЭНІ** (1898, Камянецкі р-н, *в. Пелішча* - 1973), гісторыка, філосафа

**21 студзеня – 85** гадоў з дня нараджэння **НІНЫ РЫГОРАЎНЫ ПАПОВАЙ** (21.01.1938, Камянецкі р-н, *в. Лісоўчыцы*), паэтэсы

**16 лютага – 70** гадоў з дня нараджэння **ЛАРЫСЫ АНТОНАЎНЫ БАЯРЫНЦАВАЙ (АНТОСЕВАЙ)** (1953, Брэсцкая вобл., г. *Камянец*), вядучага майстра сцэны

**16 лютага – 135** гадоў з дня нараджэння **СЯМЁНА АНДРЭЕВІЧА ДУБОВІКА** (партыйны псеўданім *Андрэй, Стары, Балюк*; 1888, Камянецкі р-н, в. *Нароўшчына* – 1937), дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі

**17 лютага – 95** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ МІХАЙЛАВІЧА ШЫШЧЫЦА** (1928, Камянецкі р-н, *в. Стралі*), настаўніка

**1 сакавіка – 170** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ВАСІЛЬЕВІЧА КАЧАНОЎСКАГА** (1853, Гродзенская губернія, *в. Вялікі Лес* (цяпер вёска ў Камянецкім р-не) – 1901), рускага і беларускага філолага-славіста і педагога

**5 сакавіка – 75** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ДЗЯМЕНЦЬЕВІЧА ГУЦЭВІЧА** (1948, Камянецкі р-н, *в. Дзмітровічы*), інжынера лясной гаспадаркі, кандыдата біялагічных навук

**12 сакавіка – 80** гадоў з дня нараджэння **ВЕРЫ ПАЎЛАЎНЫ ПРАКАПОВІЧ** (1943, Камянецкі р-н, *в. Малыя Мурыны*), паэткі, празаіка, песенніка

**25 красавіка – 95** гадоў з дня нараджэння **СВЯТЛАНЫ ЛЕАНІДАЎНЫ КУРЫЛЁВАЙ** (1928, г. Житомір – 2011), пісьменніцы

**6 мая – 85** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ВАСІЛЬЕВІЧА ЗАРЭЦКАГА** (1938, Камянецкі р-н, *в. Навіцкавічы* – 2013), беларускага графіка, жывапісца

**8 мая – 85** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ ЯКАЎЛЕВІЧА ГУЛЬКО** (1938, Камянецкі р-н, *в Вайская* – 2013, Масква), генерал-лейтэнанта, кандыдата ваенных навук, дацэнта

**11 мая – 140** гадоў з дня нараджэння **МОШЕ ЭЛЬЯХА ЖЭРНЕНСКАГА** (1883, *Каменец-Літоўск* – 1949, Іерусалім), яўрэйскага пісьменніка, перакладчыка

**20 мая – 130** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ЛУКІЧА РУДЧУКА** (1893, Камянецкі р-н *в. Бардзёўка* – 1969), генерал-маёра (1940)

**20 мая – 65** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ АНДРЭЕВІЧА ТУРА** (1958, Камянецкі р-н, *в. Стралі*), прафесійнага ваеннага, паэта

**6 чэрвеня - 75** гадоў **з** дня нараджэння **ЛЮБОВІ КЛІМЕНЦЬЕЎНЫ ХАРЛАМЕНКА** (1948, Камянецкі р-н, *в. Селяховічы*), бухгалтара, выкладчыка.

**15 чэрвеня – 85** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МАКСІМАВІЧА КАЛТАНЮКА** (1938, Камянецкі р-н, *в. Бялёва* – 2002), беларускага вучонага ў галіне хірургіі

**15 чэрвеня – 75** гадоў **з** дня нараджэння **ЮРЫЯ ІВАНАВІЧА САХАРЧУКА** (1948, Камянецкі р-н, *г. Высокае* - 2021, інжынера-механіка, дырэктара Высокаўскага Дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійна-тэхнічнага каледжа

**16 чэрвеня – 155** гадоў **з** дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ПАРФІР'ЕВІЧА ЮЗЬВЮКА** (1868, Брэсцкі павет Гродзенскай губерніі, *агр. Дзмітровічы* (цяпер *в. Дзмітровічы* Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці) – пасля 1930), протаіерэя

**12 ліпеня - 75** гадоў з дня нараджэння **АЛЫ ПЯТРОЎНЫ АГАРКАВАЙ** (1948, Высокаўскі р-н Брэсцкай вобл., *в. Яцкавічы* (цяпер Брэсцкага раёна), настаўнік

**1 жніўня – 125** гадоў з дня нараджэння **ІЛЛІ САВІЧА ГАЛКІНА** (1898, Камянецкі р-н, *в. Панасюкі* — 1990), вучонага-гісторыка, заслужанага дзеяча навукі Расіі

**5 жніўня – 135** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНІДА КАНДРАТАВІЧА ГРЭБЕНЯ** (1888, Брэст-Літоўскі павет, *с. Крынкі* (цяпер Камянецкі р-н) — 1980), савецкага вучонага ў галіне селекцыі сельскагаспадарчых жывёл

**24 верасня – 145** гадоў з дня нараджэння **ЮЗАФА ЭДВАРДА ПУЗЫНЫ** (1878, Камянецкі р-н, *в. Грымяча* – 1949), гісторыка, пісьменніка, паэта

**4 кастрычніка – 45** гадоў з дня нараджэння **ЯРЫНЫ ДАШЫНАЙ** (1978, Камянецкі р-н, *в. Ставы*), паэтэсы

**3 кастрычніка – 50** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ ПЯТРОЎНЫ КАНДРАШУК** (1973, Камянецкі р-н, *в. Камянюкі*), паэтэсы

**8 лістапада – 220** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА АЛЯКСЕЕВІЧА ГАЛУБОВІЧА (АРХІЕПІСКАПА МІХАІЛА)** (1803, Брэсцкі павет Гродзенскай губерніі, *Высока-Літоўск* – 1881), архіепіскапа Мінскага і Бабруйскага, доктара багаслоўя, аднаго з выдатных дзеячаў па аб'яднанню ўніятаў з Праваслаўнай царквой